# Выступленне кіраўніка дэлегацыі Беларускай ССР К. В. Кісялёва

## ў Палітычным камітэце XI сесіі Генеральнай Асамблеі ААН па пытанню аб Заходнім Ірыяне 28 лютага 1957 года

Н'Ю-ЙОРК, 28 лютага. (ТАСС). Выступаючы ў Палітычным камітэце Генеральнай Асамблеі ААН, К. В. Кісялёў заявіў:

Пан старшыня,

панове дэлегаты,

Палітычны камітэт разглядае пытанне аб Заходнім Ірыяне (Заходняя Новая Гвінея), унесенае 15 дэлегацыямі краін Азіі і Афрыкі.

Наша дэлегацыя ўважліва выслухала выступленне прадстаўніка Інданезіі пана Суджарво і адказ прадстаўніка Нідэрландаў пана Схюрмана. У сваім выступленні пан Суджарво прывёў пераканаўчыя довады і аргументы, якія абгрунтоўваюць правільнасць пазіцыі ўрада Інданезіі ў адносінах да Заходняга Ірыяна. Урад Нідэрландаў, як вядома, адмовіўся працягваць перагаворы з урадам Інданезіі па пытанню аб перадачы Заходняга Ірыяна Інданезіі. Урад Інданезіі імкнецца знайсці шлях мірнага вырашэння пытання аб Заходнім Ірыяне, насельніцтва якога складае каля аднаго мільёна чалавек.

Мы бачым, што двухбаковыя перагаворы паміж двума ўрадамі, якія прадугледжаны пагадненнем 1949 года, нажаль, закончыліся праваламі і гэты правал, у сваю чаргу, прывёў да пагаршэння адносін паміж Інданезіяй і Нідэрландамі. Апошнія перагаворы, якія мелі месца ў Жэневе з снежня 1955 года па люты 1956 года, былі таксама беспаспяховымі, нягледзячы на рашэнне Генеральнай Асамблеі ад 16 снежня 1955 года, у якім Асамблея выказвала надзею, што перагаворы будуць плённымі.

Такім чынам, пытанне аб Заходнім Ірыяне застаецца нявырашаным і працягвае быць крыніцай неладу і ненармальных узаемаадносін паміж Інданезіяй і Нідэрландамі: ключаных паміж Інданезіяй і Нідэрландамі. Канферэнцыя краін Азіі і Афрыкі настойліва заклікае ўрад Нідэрландаў як мага хутчэй аднавіць перагаворы, каб выканаць абавязацельствы, прынятыя ім на сябе на падставе памянёных вышэй пагадненняў, і выказвае сур'ёзную надзею, што ААН зможа садзейнічаць зацікаўленым бакам у мірным вырашэнні спрэчкі».

Арганізацыя Аб'едналых Нацый, натуральна, не можа прайсці міма гэтага заклiку краін Азіі і Афрыкі, якія прадстаўляюць значную частку чалавецтва. Мірнага ўрэгулявання пытання аб Заходнім Ірыяне патрабуе і цяперашняя міжнародная абстаноўка.

Што датычыць сутнасці пытання аб суверэнітэце над Заходнім Ірыянам, то дэлегацыя Беларускай ССР выразна выклала сваю пазіцыю па гэтаму пытанню яшчэ на папярэдніх сесіях Генеральнай Асамблеі. Як і раней, мы лічым, што Заходні Ірыян гістарычна і з прававога пункту погляду з'яўляецца неад'емнай часткай Рэспублікі Інданезіі. Яшчэ 2 лістапада 1949 года ў акце аб перадачы суверэнітэту, заключаным паміж Нідэрландамі і Інданезіяй на Гаагскай канферэнцыі «круглага стала», Нідэрланды перадалі неабмежаваны суверэнітэт над Інданезіяй Рэспубліцы Злучаных Штатаў Інданезіі і прызналі гэтую рэспубліку незалежнай і суверэннай дзяржавай. У артыкуле 1 нідэрландскай канстытуцыі 1922 года, змененым у 1948 годзе, прама гаварылася, што «Нідэрландскае каралеўства складаецца з Нідэрландаў, Інраў выкарыстоўваюцца афіцэры з былой галандскай каланіяльнай арміі. Галандскі адмірал у адстаўцы Хелфрых у артыкуле ў газеце «Алгемейн дагблад» ад 22 студзеня 1955 года дамагаўся таго, каб Галандыя падрыхтавала ў Новай Гвінеі «моцную дубінку». Так і напісана— «моцную дубінку». Можна было-б прывесці і рад іншых такіх паведамленняў. Нядзіўна, што такое становішча рэчаў не можа не выклікаць трывогі ва ўрада і народа Інданезіі, якія патрабуюць мірнага вырашэння пытання ў Заходнім Ірыяне.

З матэрыялаў, якія дала ў наша распараджэнне дэлегацыя Інданезіі, мы бачым, што эканоміка Заходняга Ірыяна знаходзіцца ў цяжкім становішчы. За перыяд больш чым трыста год каланіяльнага панавання амаль нічога не зроблена для эканамічнага развіцця Заходняга Ірыяна, тэрыторыя якога ў дванаццаць разоў большая, чым тэрыторыя Галандыі. Гэта цікавы факт.

Пасля адкрыцця месцанараджэння нафты ў 1935 годзе кампаніі «Раял датч-шэл», «Стандард ойл компані» і «Пасіфік ойл компані» стварылі пры суадносінах акцый 40—40—20 «нафтавую кампанію ў Галандскай Новай Гвінеі». Яна так цяпер і называецца—«Нафтавая кампанія ў Галандскай Новай Гвінеі». Гэтая кампанія ўладае дзесяццю мільёнамі гектараў зямлі. Супрацiўленне, якое аказваецца галандцамі ў вяртанні гэтай тэрыторыі Інданезіі, бясспрэчна, мае сваю сувязь і з тым фактам, што, як паведамляла ў чэрвені мінулага года інданезійская газета «Харыян ракʼят», «галандцы пачалі распрацоўку уранавых руд Заходняга Ірыяна».

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы